Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАСТАЦТВАЗНАЎЧЫ СЕМІНАР

Тыпавая вучэбная праграма
для ўстаноў вышэйшай адукацыі
па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства
(інтэграванае)

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*В.П. Пракапцова,* загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»;

*В.У. Дадзіёмава,* загадчык кафедры беларускай музыкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», доктар мастацтвазнаўства, прафесар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 27.10.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 29.11.2011 г.);

*навукова-метадычным* саветам па мастацтвазнаўстве Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 6 ад 18.01.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В.П. Пракапцова*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма «Мастацтвазнаўчы семінар» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках) напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае).

Дысцыпліна «Мастацтвазнаўчы семінар» накіравана на фарміраванне ў студэнтаў інтэграванага, кампаратыўнага прынцыпу вывучэння ўсіх відаў традыцыйных (музычнага, тэатральнага, выяўленчага) і тэхнагенных (кіна-, відэа-, тэлевізійнага, экраннага) мастацтваў, развіццё навыкаў правядзення пашыранага культуралагічнага аналізу мастацкага твора, а таксама на засваенне метадаў напісання самастойных аналітычных тэкстаў.

«Мастацтвазнаўчы семінар» як інтэграваная, тэарэтычная і практыка-арыентаваная дысцыпліна абапіраецца на інавацыйную метадалогію кампаратыўнага асэнсавання і вывучэння культуралагічнай і мастацтвазнаўчай практыкі і здзяйсняе сувязі з комплексам сацыяльна-гуманітарных і прыродазнаўчых навук: «Філасофія», «Педагогіка і псіхалогія», «Сацыялогія» і інш.

*Мэта* дысцыпліны – навучыць тэарэтычна асэнсоўваць, крытычна аналізаваць і апісваць творы і з’явы мастацтва.

*Задача* дысцыпліны – набыць уменні пісьмова выказваць асабістае меркаванне аб функцыянаванні артэфактаў у розных жанрах мастацтвазнаўчых работ.

У выніку засваення дысцыпліны выпускнікі павінны *ведаць:*

– прынцыпы перыядызацыі мастацтвазнаўства;

– жанравыя разнавіднасці мастацтвазнаўчых даследаванняў;

– спецыфіку мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства;

– гістарычныя працэсы развіцця мастацтвазнаўства;

– прынцыпы перыядызацыі мастацтва і мастацтвазнаўства;

– працы вядучых даследчыкаў у галіне мастацтвазнаўства і культуралогіі;

– класіфікацыю жанраў мастацтвазнаўчых даследаванняў;

– сучасныя прынцыпы ўспрымання мастацтва і аналітыкі творчых працэсаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– выяўляць кампаратыўныя падыходы да стварэння твораў мастацтва розных гістарычных перыядаў;

– вызначаць тыпалогію і класіфікацыю жанраў мастацтвазнаўчых даследаванняў;

– выказваць пісьмова асабістае меркаванне ў розных жанрах мастацтвазнаўчых прац;

– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай мастацтвазнаўчай практыцы;

– крытычна ацэньваць асаблівасці развіцця сучаснай мастацкай культуры;

– праводзіць аналіз вербальных мастацтвазнаўчых тэкстаў у гістарычнай рэтраспектыве іх стварэння;

– пісьмова выкладаць свае аналітычныя меркаванні ў розных жанрах мастацтвазнаўчых даследаванняў;

– выкарыстоўваць атрыманыя веды і навыкі ў навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці.

*Метады (тэхналогіі)* навучання:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– навукова-пошукавыя метады на аснове вывучэння спецыяльнай мастацтвазнаўчай і культуралагічнай літаратуры;

– аўдыявізуальны аналіз артэфактаў;

– камунікатыўныя тэхналогіі (даклады, дыскусіі, выступленні, аналітычны агляд, рэцэнзаванне і г.д.).

У межах дысцыпліны «Мастацтвазнаўчы семінар» мяркуецца правядзенне студэнтамі самастойнай работы з асноўнай і дадатковай літаратурай, з асобнікамі перыядычнага друку ў галіне мастацкай культуры, наведванне мастацкіх музеяў, галерэй, тэатраў, філармоній, знаёмства з гістарычнымі і сучаснымі працэсамі фарміравання мастацкай творчасці.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Мастацтвазнаўчы семінар» усяго прадугледжана 140 гадзін, з якіх 80 гадзін – аўдыторныя заняткі (14 гадзін – лекцыйныя заняткі, 66 гадзін – семінарскія заняткі).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінары |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Гісторыя мастацтвазнаўства** | | | |
| *Тэма 1.* Мастацтвазнаўства як комплекс навук, якія вывучаюць тэорыю і гісторыю музычнага, тэатральнага, выяўленчага і экраннага мастацтваў | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 2.* Вытокі мастацтвазнаўства. Формы і прынцыпы вывучэння мастацтваў у эпохі Антычнасці і Сярэдніх вякоў | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Формы і прынцыпы вывучэння мастацтваў у эпоху Новага часу | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Мастацтвазнаўства Навейшага часу. Вядучыя праблемы, канцэпцыі, аўтары | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Беларускае мастацтвазнаўства | 2 | 2 | |
| **Раздзел II. Тэорыя мастацтвазнаўства** | | | |
| *Тэма 6.* Прынцыпы перыядызацыі гісторыі мастацтва і мастацтвазнаўства | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Тыпалогія жанраў мастацтвазнаўчых даследаванняў | 4 | | 4 |
| *Тэма 8.* Тэарэтычныя аспекты вывучэння музычнага, тэатральнага, выяўленчага і экраннага мастацтваў | 2 | | 2 |
| **Раздзел III. Практыка мастацтвазнаўства** | | | |
| *Тэма 9.* Характарыстыка навукова-публіцыстычных жанраў | 4 | | 4 |
| *Тэма 10.* Класіфікацыя рэцэнзій | | | 2 |
| *Тэма 11.* Рэалізацыя вопыту і патрабаванні да напісання рэцэнзій | 16 | | 16 |
| *Тэма 12.* Класіфікацыя артыкулаў | 2 | | 2 |
| *Тэма 13.* Рэалізацыя вопыту і патрабаванні да напісання артыкула | 18 | | 18 |
| *Тэма 14.* Курсавая работа па мастацтвазнаўстве як мадэль аўтарскага даследавання. Асноўныя патрабаванні і прынцыпы напісання | 6 | | 6 |
| **Усяго…** | **80** | **14** | **66** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта, задачы, структура курса, вучэбна-метадычнае забеспячэнне, сувязь з іншымі дысцыплінамі, прынцыпы арганізацыі самастойнай работы.

## Раздзел І. Гісторыя мастацтвазнаўства

### *Тэма 1. Мастацтвазнаўства як комплекс навук, якія вывучаюць тэорыю і гісторыю музычнага, тэатральнага, выяўленчага і экраннага мастацтваў*

Мастацтвазнаўства як інтэграваная навука, якая вывучае развіццё музычнага, тэатральнага, выяўленчага і экраннага мастацтваў. Трыадзінства мастацтвазнаўства: гісторыя, тэорыя, мастацкая крытыка. Мастацтвазнаўства як сукупнасць навуковых і вучэбных дысцыплін. Цэласнае вывучэнне прынцыпаў развіцця формы і зместу мастацкага твора і яго бытавання ў пэўным сацыякультурным кантэксце.

### *Тэма 2. Вытокі мастацтвазнаўства. Формы і прынцыпы вывучэння мастацтваў у эпохі Антычнасці і Сярэдніх вякоў*

Першыя вучэнні аб музыцы ў культуры старажытных цывілізацый Усходу (Кітай, Індыя, Месапатамія). Сінкрэтычнасць мастацкіх уяўленняў у эпоху Антычнасці. Вучэнне аб этасе. Пытанні акустыкі. Фарміраванне мастацкай тэрміналогіі. Тэарэтычнае асэнсаванне прынцыпаў развіцця мастацтваў у філасофскіх трактатах Піфагора і піфагарэйцаў, Платона і яго калег па Афінскай акадэміі, Арыстаксена, Гарацыя, Вітрувія, Цыцэрона, Пінія Старэйшага і інш. Заснавальнік музыказнаўства як навукі рымлянін Баэцый і яго пяцітомная праца «Аб музычных устанаўленнях».

Тэорыя тэатральнага і выяўленчага мастацтва як неаддзельная частка тэалагічнага светапогляду ў эпоху Сярэднявечча. Тэртуліян і яго праца «Аб відовішчах». Разуменне музыкі як навукі ў эпоху Сярэднявечча. Італьянскі музыкант, тэарэтык, педагог Гвіда д’Арэца і яго рэформа натацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новыя крытэрыі ацэнкі мастацкіх твораў і новы ўзровень мастацка-тэарэтычнай навукі ў эпоху Адраджэння. Заснавальнік гісторыі мастацтваў Дж.Вазары і яго кніга «Жыццеапісанні найбольш знакамітых жывапісцаў, скульптараў і дойлідаў». З'яўленне першых музычных слоўнікаў. Нідэрландскі кампазітар і вучоны Іганес Цінкторыс і яго працы «Вызначальнік музычных тэрмінаў» і «Кніга аб мастацтве кантрапункта». Практычна-тэарэтычныя даследаванні аб гармоніі, працы французскіх тэарэтыкаў у галіне тэатра Ф. Абіняка «Практыка тэатра» і Н.Буало «Паэтычнае мастацтва», трактат Леанарда да Вінчы «Аб жывапісе», тэарэтычна-метадычная дзейнасць Ч. Чэніні, Л.-Б. Альберці, А. Дзюрэра.

### *Тэма 3. Формы і прынцыпы вывучэння мастацтваў у эпоху Новага часу*

Уяўленні аб усемагутнасці чалавечага розуму, прыярытэце асветы і навукі ў эпоху Асветніцтва. Мастацтвазнаўчыя працы філосафаў-«энцыклапедыстаў» Д.Дзідро, Ж.-Ж.Русо, Вальтэра, нямецкага асветніка Г.Э.Лесінга.

Завяршэнне складвання мастацтвазнаўства як навукі ў XIX ст. (Г. Вёльфлін). Зацвярджэнне тэрміна «музыказнаўства» (А. М. Сяроў). Увасабленне ідэі сінтэзу мастацтваў у дзейнасці творцы-рамантыка. Разуменне сінтэтычнага ўзаемадзеяння жывапісу, музыкі і літаратуры, паняцце сутнаснага адзінства мастацтваў – аснова эстэтыкі рамантызму. Р.Вагнер як філосаф і тэарэтык мастацтва. Яго распрацоўка тэорыі «музычнай драмы». Пашыранае асвятленне праблем мастацтва ў газетах і часопісах.

### *Тэма 4. Мастацтвазнаўства Навейшага часу. Вядучыя праблемы, канцэпцыі, аўтары*

Галоўныя тэндэнцыі і прыкметы, якія фарміравалі мастацтва XX ст.: сацыяльна-гістарычныя ідэі, нацыянальныя асаблівасці, ідэйна-мастацкая праблематыка. Эвалюцыя тэарэтычных поглядаў на «новае» мастацтва і ўплыў на яго развіццё прапагандысцкай дзейнасці Ф. Марынеці, П. Пікаса, Г. Мюнха, С. Далі, В. Кандзінскага, К. Малевіча. Тэарэтычнае асэнсаванне авангардызму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковыя даследаванні ў галіне музычнага мастацтва (Х. Рыман, Э. Курт, іх распрацоўкі ў межах тэорыі музыкі; музычна-тэарэтычныя працы Г.Аберта, Х.Мерсмана, Х. Штукеншмідта і інш.). Музычна-крытычная і навуковая дзейнасць Б. Асаф'ева (Ігара Глебава). Выдатныя прадстаўнікі савецкага музыказнаўства – І. Салерцінскі, С. Скрабкоў, Л. Мазель, Г. Хубаў, А. Альшванг, Ю. Келдыш, Т. Ліванава, А. Сохар і інш. Іх навуковыя працы і крытычныя выступленні па праблемах музычнага мастацтва.

Навукова-тэарэтычныя працы аб тэатры Р. Ралана, Б. Брэхта і інш. К. Станіслаўскі і значэнне яго працы «Работа акцёра над сабой». Навукова-даследчыя манаграфіі А. Анастасьева, Б. Рудніцкага, Г. Баяджыева, Б. Растоцкага, А. Анікста, Ю. Дзмітрыева, С. Макульскага, М. Кнэбель, Б. Захавы, У. Сахноўскага-Панкеева, Г. Таўстаногава, А. Эфраса і інш. Іх роля ў развіцці сучаснай навукі аб тэатры.

Тэарэтычнае абгрунтаванне тэрміна «сацыялістычны рэалізм».

Асноўныя тэарэтычныя распрацоўкі ў галіне кінамастацтва. «Маніфест сямі мастацтваў» Р.Кануда (1911) – першая спроба тэарэтычных абагульненняў на пачатку ХХ ст. Тэарэтычныя даследаванні Б. Балаша, Р. Арнхейма, С. Эйзенштэйна, У. Пудоўкіна і інш. Фундаментальныя даследаванні гісторыі кінамастацтва Ж. Садуля, Е. Цепліцы і Е. Плажэўскага.

### *Тэма 5. Беларускае мастацтвазнаўства*

Першыя факталагічныя звесткі пра развіццё музычнага, тэатральнага, выяўленчага мастацтва ў старажытных летапісах, трактатах, дыярыушах. Перыядычны друк другой паловы XIX – пачатку ХХ ст. як інфармацыйная крыніца мастацтвазнаўчых даследаванняў. Беларускае мастацтвазнаўства як самастойная галіна навукі ў ХХ ст. Асобы, кірункі, формы выданняў. Мастацтвазнаўчыя манаграфіі і іх аўтары, шматтомнікі па гісторыі мастацтваў, энцыклапедыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел II. Тэорыя мастацтвазнаўства

## *Тэма 6. Прынцыпы перыядызацыі гісторыі мастацтва і мастацтвазнаўства*

Асноўныя падыходы да праблемы перыядызацыі мастацтва і мастацтвазнаўства. Соцыум і мастацкая культура. Цывілізацыя і культура. Эвалюцыя мастацкага светаўспрымання. Эпоха і стыль. Выканальніцкі стыль. Манера і інтэрпрэтацыя. Сувязь мастацтвазнаўства з іншымі навукамі.

## *Тэма 7. Тыпалогія жанраў мастацтвазнаўчых даследаванняў*

Трактат, апісанне, «жыццеапісанні» мастакоў (напрыклад, Дж. Вазары, што вызначыла пачатак гісторыі мастацтва як навукі).

Артыкул (навуковыя, публіцыстычныя, літаратурна-крытычныя, праблемныя, дыскусійныя, агляднвя, канстатуючыя і г.д.). Рэцэнзія (аўтарэцэнзія, крытычна-публіцыстычная, анатацыйна-інфармацыйная, унутраная, навуковая). Эсэ, інтэрв’ю, анатацыя, нарыс. Манаграфія, альбом мастацкі, ноты, альманах.

Шматтомныя выданні, слоўнікі, энцыклапедыі.

## *Тэма 8. Тэарэтычныя аспекты вывучэння музычнага, тэатральнага, выяўленчага і экраннага мастацтваў*

Абгрунтаванне звароту да пэўнага аб’екта даследавання. Навуковасць асэнсавання. Сувязь тэарэтычных ведаў з практыкай напісання. Самастойнасць і вобразнасць мыслення. Выкарыстанне спецыяльнай лексікі і тэрміналогіі. Дакладнасць моўнай стылістыкі. Наяўнасць навуковых (рэдактарскіх) каментарыяў да мастацкіх тэкстаў, красамоўнасць цытавання, адукацыйная накіраванасць мастацтвазнаўчага тэксту, акадэмічнасць, навуковасць каментарыяў, бібліяграфічная аснашчанасць.

Сінтэз аўтарскай логікі выказвання і агульнапрынятых метадаў і прынцыпаў напісання тэксталагічнага аналізу мастацкага твора, спалучэнне тэарэтычных ведаў і практыкі назірання за актуальным мастацкім жыццём, карэктнае выкарыстанне дакументальна-факталагічнага матэрыялу, абгрунтаванне асабістых абагульненняў і вывадаў, карыстанне вобразнай, эмацыянальнай мовай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел III. Практыка мастацтвазнаўства

## *Тэма 9. Характарыстыка зместу навукова-публіцыстычных жанраў*

Мэта мастацтвазнаўчых публікацый. Апісальнасць фактаў. Аналіз і аўтарская ацэнка прэзенціруемых з'яў. Аб'ектыўнасць інфармавання. Метады даследавання.

## *Тэма 10. Класіфікацыя рэцэнзій*

Рэцэнзія на зборны канцэрт ці калектыўную выстаўку; рэцэнзія на сольны канцэрт ці аўтарскую выстаўку; рэцэнзія на спектакль; рэцэнзія на кінакарціну; рэцэнзія на апублікаванае даследаванне (манаграфію, зборнік артыкулаў, альбом твораў выяўленчага мастацтва, нотную хрэстаматыю і інш.).

## *Тэма 11. Рэалізацыя вопыту і патрабаванні да напісання рэцэнзій*

Прыкладная структура напісання рэцэнзіі на пэўны артэфакт: прынцып аб'яднання выканаўцаў ці мастакоў, агульнае і асабістае ў творчасці ўдзельнікаў канцэрта ці выстаўкі, вызначэнне значнасці дадзенага канцэрта (выстаўкі ці спектакля) для іх асабістай творчасці, а таксама для горада, краіны і г.д. Праграма (рэпертуар), яе жанравая разнастайнасць, стыль і манера мастака (музыканта-выканаўцы, драматычнага акцёра), занатаванне асабістага ўражання рэцэнзента і рэакцыі гледача (слухача) і г.д. Адлюстраванне трыадзінства ўмоў для выніковага здзяйснення канцэрта (выстаўкі ці спектакля): прадстаўленыя мастацкія творы – іх інтэрпрэтацыя (тэматыка, стылістыка) – успрыманне слухачом (гледачом). Адлюстраванне сінтэтычнай прыроды музычнага, драматычнага спектакля ці кінатвора. Вызначэнне творчага адзінства ці дамінантнага гучання аднаго (ці некалькіх) са стваральнікаў спектакля ці кінафільма: драматургічная аснова – рэжысёр – сцэнограф – дырыжор – балетмайстар – выканаўцы галоўных роляў – хор – кардэбалет – масавыя сцэны – касцюм – грым – асвятленне – агульная рытміка і пластыка спектакля ці кінафільма – кампелятыўная ці спецыяльна напісаная музыка, якая выступае (ці не выступае) сродкам драматургіі – кампазіцыя кадра – мантаж –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэльнасць драматургічнай кампазіцыі і г.д. Асэнсаванне жанравых асаблівасцей, неабходнасць валодання спецыяльнай прафесійнай мастацтвазнаўчай лексікай. Далікатныя адносіны да ацэнкі работы аўтараў і выканаўцаў.

Прыкладная структура напісання рэцэнзіі на апублікаванае даследаванне: праблематыка, змест кнігі, яе структура, кампазіцыя, мова выказвання, ступень яе навуковасці, складанасці, публіцыстычнасці. Звесткі аб аўтары. Вызначэнне жанру выдання (манаграфія, зборнік артыкулаў, альбом твораў выяўленчага мастацтва, нотная хрэстаматыя і г.д.). Адзначэнне наяўнасці і якасці рэпрадукцый і ілюстрацый. Вызначэнне распрацаванасці тэматыкі ў існуючай спецыяльнай літаратуры, каштоўнасць рэцэнзуемай працы.

### *Тэма 12. Класіфікацыя артыкулаў*

Публіцыстычны і навукова-папулярны артыкул; энцыклапедычны і навукова-праблемны артыкул; манаграфічны артыкул; аналітычны артыкул манаграфічнага выдання і ўступны артыкул да альбома рэпрадукцый ці нотнага выдання.

### *Тэма 13. Рэалізацыя вопыту і патрабаванні да напісання артыкула*

Вызначэнне мэты напісання артыкула, актуальнасці і складанасці стану праблемы, аб’екта аналізу. Інфарматыўнасць, насычанасць актуальнымі фактамі, назіраннямі, абагульненнямі, вырашэнне асветніцкіх задач. Натуральнасць, а не дэкларатыўнасць меркаванняў, ужыванне навуковай тэрміналогіі, аргументаванасць, доказальнасць тлумачэнняў. Звесткі аб аўтары (аўтарах) рэпрадуцыруемых твораў мастацтва, вызначэнне іх стылістыкі, асаблівасцей выразнай мовы. Біябібліяграфічныя даныя.

### *Тэма 14. Курсавая работа па мастацтвазнаўстве як мадэль аўтарскага даследавання. Асноўныя патрабаванні і прынцыпы напісання*

Вучэбна-даследчы характар курсавой работы як аснова для далейшай навуковай дзейнасці. Мэта курсавой работы ў межах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысцыпліны «Мастацтвазнаўчы семінар» – фарміраванне навыкаў і авалоданне метадамі мастацтвазнаўчага ці культуралагічнага даследавання. Вызначэнне тыпаў курсавых работ іх тэматычнай разнастайнасцю: гісторыка-канцэптуальныя, «панарамныя», манаграфічныя, жанрава-аналітычныя, тэарэтыкасэнсавыя і г.д.

Структура курсавой работы. Уводзіны (вызначаюцца актуальнасць тэмы, мэта і задачы курсавой работы, аб’ект і прадмет даследавання, метадалогія і метады праведзенага даследавання, агляд выкарыстанай літаратуры, структура курсавой работы). Асноўная частка (дзве ці тры главы, кожная з якіх можа складацца з пэўных раздзелаў). Заключэнне (вынікі курсавога даследавання). Бібліяграфічны спіс. Дадаткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Бонфельд, М. Ш.* Введение в музыковедение : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / М. Ш. Бонфельд. – М. : Гуманит. изд. центр «ВЛАДОС», 2001. – 224 с. : ноты.

2. *Бронфин, Е. Ф.* О современной музыкальной критике : пособие для семинаров / Е. Ф. Бронфин. – М. : Музыка, 1977. – 320 с.

3. *Ванслов, В. В.* Эстетика, искусство, искусствознание : опросы теории и истории / В. В. Ванслов. – М. : Изобр. искусство, 1983. – 440 с.

4. *Введение* в литературоведение : Основные понятия и термины : учеб. пособие / Л. В. Чернец, В. Е. Хамцев, С. Н. Бройтман [и др.] / под ред. Л. В. Чернец. – М. : Высш. шк. : Изд. центр «Академия», 1999. – 556 с.

5. *История* европейского искусствознания : От Античности до конца XVIII века. Ин-т истории искусств М-ва культуры СССР / отв. ред. Б. Р. Виппер, Т. Н. Ливанова. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – 463 с.

6. *История* европейского искусствознания: в 2 кн. Кн. 2 : Вторая половина XIX века – начало XX века. Ин-т истории искусств М-ва культуры СССР / отв. ред. Б. Р. Виппер, Т. Н. Ливанова. – М. : Наука, 1969. – 472 с.

7. *История* европейского искусствознания : в 2 кн. Кн. 2 : Вторая половина XIX века – начало XX века (1871–1917). Ин-т истории искусств М-ва культуры СССР / отв. ред. Б. Р. Виппер, Т. Н. Ливанова. – М. : Наука, 1969. – 293 с.

8. *Прокопцова, В. П.* Эпоха и стиль: к вопросу о периодизации истории искусств и формировании искусствоведческих терминов / В. П. Прокопцова // Прырода, чалавек, культура : матэрыялы Міжнар. навук. канф. : у 2 ч. / рэдкал.: М. А. Бяспалая, І. Л. Коган, А. І. Смолік. – Мінск : БДУ культуры, 2003. – Ч. 1. – С. 318–326.

9. *Прокопцова, В. П.* Компаративное искусствоведение : проблемы исследования / В. П. Прокопцова // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 25–26 марта 2004 г. / отв. ред. У. Д. Розенфельд : в 2 ч. – Гродно : ГрГУ, 2004. – Ч. 1. – С. 18–22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Асафьев, Б.* Теория музыкально-исторического процесса как основа музыкально-исторического знания / Б. Асафьев // Задачи и методы изучения искусств. – Пб. : Academia, 1924. – С. 63–80.

2. *Бахтин, М. М.* К методологии гуманитарных наук / М. М. Бахтин // Эстетика словесного творчества. – М. : Искусство, 1979. – С. 361–373.

3. *Блауберг, И. В.*Становление и сущность системного подхода / И. В. Блауберг, Э. Г. Юдин. – М. : Наука, 1973. – 270 с.

4. *Вельфин, Г.* Основные понятия истории искусств : Проблема эволюции стиля в новом искусстве / Г. Вельфин. – СПб. : Мифрил, 1994. – 427 с.

5. *Виппер, Б. Р.* Статьи об искусстве / Б. Р. Виппер. – М. : Искусство, 1970. – 591 с.

6. *Власов, В.Г.* Стили в искусстве : словарь / В. Г. Власов. – СПб. : Кольна, 1995. – 672 с. : ил.

7. *Гёте, И.-В.* Об искусстве : сб. / сост., вступ. ст. и примеч. А. В. Гулыги / И.-В. Гёте. – М. : Искусство, 1975. – 623 с. : ил.

8. *Золтан, Д.* Этос и аффект. История философской музыкальной эстетики от зарождения до Гегеля: пер. с нем. / Денеш Золтан. – М. : Прогресс, 1977. – 371 с.

9. *Из истории* музыкознания в Беларуси : Белорус. гос. акад. музыки : 1932–1992 : учеб. пособие / Г. С. Глущенко, Р. И. Сергиенко, К. И. Степанцевич [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2002. – 366 с.

10. *Каган, М. С.* Морфология искусства : Историко-теоретическое исследование внутреннего строения мира искусств / М. С. Каган. – Л. : Искусство, 1972. – 440 с.

11. *Марков, М.* Искусство как процесс : Основы функциональной теории искусства / М. Марков. – М. : Искусство, 1970. – 329 с.

12. *Нечай, О. Ф* Телевидение как художественная система / О. Ф. Нечай. – Минск : Наука и техника, 1981. – 256 с.

13. *Нечай, О.Ф.* Ракурсы : О телевизионной коммуникации и эстетике / О.Ф. Нечай. – М. : Искусство, 1990. – 119 с.

14. *О музыкальной* критике : Из высказываний современных зарубежных музыкантов / сост.-ред. В. Н. Брянцева. – М. : Сов. композитор, 1983. – 96 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. *Проблемы* искусствознания и художественной критики : межвузов. сб. / Ленингр. гос. ин-т им. А. А. Жданова. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1982. – 224 с.

16. *Пракапцова, В.П.* Асаблівасці развіцця мастацкай культуры і мастацкай адукацыі Навейшага часу / В. П. Пракапцова // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф. : в 2 ч. / под ред. У. Д. Розенфельда. – Гродно : ГрГУ, 2002. – Ч. 1. – 317 с.

17. *Серов, А.Н.* Музыка, музыкальная наука, музыкальная педагогика / А. Н. Серов // Статьи о музыке. Вып. 6 (1863–1866). – М. : Музыка, 1990. – С. 176–212.

18. *Философия* искусства в прошлом и настоящем / НИИ теории и истории изобраз. искусств ордена Ленина Акад. художеств СССР ; Сектор истории эстет. учений. – М. : Искусство, 1981. – 423 с.

19. *Шестаков, В. П.* От этоса к аффекту : История музыкальной эстетики от Античности до XVIII века / В. П. Шестаков. – М. : Музыка, 1975. – 351 с. : ил.

20. *Юдин, Б.* Методологический анализ науки / Б. Г. Юдин, В. С. Швырев. – М. : Знание, 1980. – 64 с.

21. *Юлдашев, Л. Г.* Искусство : философские проблемы исследования / Л. Г. Юлдашев. – М. : Мысль, 1981. – 247 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

**10 балаў**

Студэнт прадэманстраваў бліскучыя веды па гісторыі мастацтвазнаўства, перыядызацыі мастацтва і мастацтвазнаўства, бездакорна выконваў усе заданні на працягу семестра, падчас адказу паказаў высокую эрудыцыю, талент, творчыя здольнасці, патрэбны ўзровень абагульнення, выкарыстаў пры гэтым нестандартныя прыёмы і метады.

**9 балаў**

Студэнт паказаў сістэматычныя і глыбокія веды па гісторыі мастацтвазнаўства, перыядызацыі мастацтва і мастацтвазнаўства, выявіў уменні свабоднага выканання вучэбнага задання, прадугледжанага праграмай курса, нестандартны падыход, адпаведныя метады і прыёмы.

**8 балаў**

Студэнт паказаў поўнае разуменне і глыбокае веданне вучэбнага матэрыялу з невялікімі недакладнасцямі ў адным з пытанняў, якія студэнт змог самастойна выправіць пасля заўваг экзаменатара.

**7 балаў**

Студэнт даў добры самастойны адказ, прадэманстраваў поўнае разуменне і добрыя веды па тэорыі і гісторыі мастацтвазнаўства, але ў адказе не хапае аргументацыі, паслядоўнасці або ў практычнай частцы задання былі дапушчаны хібы.

**6 балаў**

Студэнт даў правільны адказ, раскрыў асноўны змест курса, прадэманстраваў веды і разуменне вучэбнага матэрыялу, пры гэтым дапусціў нязначныя памылкі ў адным з пытанняў, якія змог самастойна выправіць.

**5 балаў**

Студэнт раскрыў асноўны змест пытанняў, паказаў дастатковыя веды па гісторыі мастацтвазнаўства і разуменне жанравых разнавіднасцей мастацтвазнаўчых прац, але дапусціў непаслядоўнасць у адказе і нязначныя памылкі ў тэарэтычных пытаннях і практычным заданні.

**4 балы**

Студэнт праявіў веданне азначэнняў, асноўных паняццяў курса і зыходных дэфініцый, назваў жанравых разнавіднасцей мастацтвазнаўчых прац, пры гэтым адказ быў няпоўным і сла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ба аргументаваным, ва ўсіх экзаменацыйных пытаннях былі дапушчаны памылкі.

**3 балы**

Студэнт дапусціў памылкі ў азначэннях, неразуменне асобных пытанняў, фрагментарнасць ведаў, адказ на тэарэтычныя пытанні ці выкананне практычнага задання былі магчымыя толькі пры дапамозе выкладчыка.

**2 балы**

Студэнт не раскрыў экзаменацыйнае заданне, у адказе адсутнічалі азначэнні, былі дапушчаны істотныя памылкі; дадатковыя пытанні выкладчыка не выявілі наяўнасць ведаў па дысцыпліне.

**1 бал**

Студэнт адмовіўся ад адказу або пры адказе скажае сэнс, неўпарадкавана і няўпэўнена выкладае матэрыял, паказвае няведанне тэарэтычнага матэрыялу, адчувае цяжкасці ў разуменні стандартных пытанняў і не можа правільна адказаць на іх.

## Пералік
## рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і выкарыстоўваецца комплексна.

1. Праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць аналітычную працу і нефармалізаваны адказ.
2. Эмпірычнае азнаямленне з публікацыямі вядучых сучасных мастацтвазнаўцаў і вуснае рэцэнзаванне іх прац.
3. Пісьмовыя распрацоўкі ў розных мастацтвазнаўчых жанрах: рэцэнзія (на пэўны артэфакт ці манаграфічнае выданне), артыкул (па праблемах развіцця розных відаў мастацтва ці творчасці асобных мастакоў ці кампазітараў) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА КУРСАВЫХ РАБОТ

1. Інтэрпрэтацыя тэмы Радзімы ў творчай спадчыне М. К. Рэрыха.
2. Праблема ўзаемадзеяння класічнай і эстраднай музыкі (тэарэтыка-метадалагічны аспект).
3. Увасабленне тэмы любві ў рускай і беларускай музыцы XX ст.
4. Паэтыка танца ў кінамастацтве.
5. Лялечны тэатр Пятрушкі і руская тэатральная культура XIX ст.
6. Фенаменалогія героя ў кінамастацтве Фрыца Ланга.
7. Тэма Раства Хрыстова ў жывапісе.
8. Танцавальныя эпізоды ў драматургіі рускай оперы XIX ст.
9. Ракако – вядучы стыль у мастацтве Францыі эпохі праўлення Людовіка XV.
10. Карціны прыроды ў музыцы і выяўленчым мастацтве.
11. Сімяон Полацкі і яго роля ў станаўленні руска-беларускага тэатра.
12. Мастацка-крытычная думка Расіі 50–60-х гг. XIX ст. у ацэнцы А. М. Сярова і У. У. Стасава.
13. Жаночы партрэт у заходнееўрапейскім мастацтве (ад Антычнасці да канца Новага часу).
14. Генезіс і эвалюцыя стылю мадэрн у заходнееўрапейскім мастацтве мяжы XIX–XX стст.
15. Тэарэтычныя праблемы ўзаемадзеяння выяўленчага і музычнага мастацтва.
16. Увасабленне твораў Васіля Быкава ў беларускім музычным мастацтве.
17. Экран і літаратура: метады мастацкага ўзаемадзеяння.
18. Сон і яго бачанне ў гістарычнай дынаміцы мастацкай культуры.
19. Эвалюцыя мюзікла на французскай сцэне.
20. Месца пленэра ў выяўленчым мастацтве.
21. Цыкл і цыклічнасць у жывапісе і музыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# МАСТАЦТВАЗНАЎЧЫ СЕМІНАР

Тыпавая вучэбная праграма
для ўстаноў вышэйшай адукацыі
па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства
(інтэграванае)

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,12. Ул.-выд. арк. 0,71. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ